**23.** Якога слова не хапае на месцы пропуску ва ўстойлівым спалучэнні?

*Вакол … абвесці.*

**А)** рукі. **Б)** нагі. **В)** вуха. **Г)** пальца. **Д)** вока.

---

**24.** Рапсодамі ў старажытнай Грэцыі называлі складальнікаў песень і паэм, якія выконвалі свае творы пад акампанемент … .

**А)** гітары. **Б)** кіфары. **В)** балалайкі. **Г)** гармоніка. **Д)** цымбалаў.

---

**25.** Янка атрымаў заданне уставіць замест кропак у сказе патрэбныя назвы рэк. Дапамажыце хлопчыку.

*Нібы абдымаючы з чатырох бакоў свету, Беларусь абмываюць буйныя паўнаводныя рэкі: на ўсходзе – …, на захадзе – …, на поўдні – …, на поўначы – … .*

*1) Прыпяць; 2) Нёман; 3) Дзвіна; 4) Днепр.*

**А)** 1, 2, 3, 4. **Б)** 1, 3, 4, 2. **В)** 2, 1, 4, 3. **Г)** 3, 4, 2, 1. **Д)** 4, 2, 1, 3.

---

**26.** Вызначце правільна напісаныя прыклады.

*1) рака Ўса; 2) узнагарода лаурэата;*

*3) часопіс "Буся" узнагародзілі; 4) старанны аудытар.*

**А)** усе прыклады. **Б)** усе прыклады, акрамя 1.
**В)** няма патрэбных прыкладаў. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 4.

---

**27.** Па выказванню Івана Грознага дно у гэтай ракі, якую старажытныя грэкі і рымляне называлі янтарнай (Эрыдан), …, а берагі … . Пастаўце патрэбныя словы на месцы пропускаў.

*1) меднае(-ыя); 2) срэбнае(-ыя); 3) залатое(-ыя).*

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 1. **Д)** 3, 2.

---

**28.** Гэты горад называюць "сталіцай беларускага поўдня" або "беларускай Швейцарыяй". Гэта … .

**А)** Шклоў. **Б)** Барысаў. **В)** Мазыр. **Г)** Дзяржынск. **Д)** Кобрын.

---

**29.** Багатую гісторыю маюць рукапісныя кнігі, створаныя на беларускай мове арабскім пісьмом. Яны называюцца … .

**А)** летапісы. **Б)** кітабы. **В)** храналогіі. **Г)** граматы. **Д)** занатоўкі.

---

**30.** У абраднасці і павер'ях беларусаў гэты сноп надзяляўся жыватворнай, вытворчай сілай, атаясамліваўся з мужчынскім пачаткам і ўвасабляў багацце, пераемнасць і дабрабыт. Як называўся такі сноп?

**А)** гадальны сноп. **Б)** апошні сноп. **В)** сямейны сноп.
**Г)** мокры сноп. **Д)** сухі сноп.

---

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 372 36 17, 372 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 12. Тыраж 34500 экз. г. Мінск. 2019 г.

# Конкурс па беларускай мове «БУСЛІК-2019»

*Чацвер, 21 лютага 2019 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай і электроннымі сродкамі забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі. У заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1,5-2 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 5-6 класаў

**1.** Здаўна існуе народнае павер'е, што на Каляды нельга частавацца да позняга вечара, пакуль не з'явіцца(-яцца) … .

**А)** першы госць. **Б)** калядоўшчыкі. **В)** першая зорка на небе.
**Г)** музы́кі. **Д)** гаспадар.

---

**2.** Назвы якой міфалагічнай істоты не хапае на месцы пропуску ў вершаваных радках Янкі Купалы?

*Барадой … ківае,*
*Шалы нетраў спавівае.*

**А)** лясун. **Б)** балотнік. **В)** вадзянік. **Г)** дамавік. **Д)** баннік.

---

**3.** Як сцвярджаюць даследчыкі, сонца ў розную пару года мела розныя назвы:
поры года – *1) вясна; 2) лета; 3) зіма;*
назвы сонца – *а) Купала; б) Каляда; в) Ярыла.*

Суаднясіце назвы.

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-в, 2-б, 3-а. **В)** 1-б, 2-а, 3-б.
**Г)** 1-б, 2-в, 3-а. **Д)** 1-в, 2-а, 3-б.

**4.** Пра сузор’е Вялікай Мядзведзіцы захавалася шмат і легенд, і паданняў. Як называлі ў народзе гэта сузор’е? Выберыце правільныя варыянты:

*1) Воз; 2) Лось; 3) Валасыня; 4) Коўш; 5) Вялікая Павозка.*

**А)** усе варыянты. **Б)** няма патрэбных варыянтаў.
**В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

---

**5.** Юрась павінен быў уставіць у сказе замест кропак патрэбны назоўнік. Дапамажыце хлопчыку выканаць правільна заданне.

*У даўнія часы сярод памешчыкаў і шляхты было прэстыжна разводзіць побач з маёнткамі, у азёрах ці нават сажалках, … з чорнай афарбоўкай.*

**А)** куніц. **Б)** выдраў. **В)** норак. **Г)** баброў. **Д)** качак.

---

**6.** Галоўным героем паэтаў-рамантыкаў з’яўляецца … .

**А)** касманаўт. **Б)** летуценнік. **В)** лётчык. **Г)** разведчык. **Д)** дыпламат.

---

**7.** Колькі назоўнікаў у форме адзіночнага ліку ўжыта ў сказе?

*Лебедзь ляцеў, выцягнуўшы наперад сваю гнуткую шыю, рассякаючы паветра магутнымі ўзмахамі вялікіх крылаў.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

---

**8.** Закончыце народнае выслоўе:

*Ласкавае слоўка, як сонейка, … .*

**А)** выглядае. **Б)** грэе. **В)** заходзіць. **Г)** усміхаецца. **Д)** свеціць.

---

**9.** Колькі **[л]** у словах вершаваных радкоў Г. Бураўкіна?

*Каля дарогі жыта ў полі,*
*Вярба старая ля ракі,*
*Ды ў жоўтым восеньскім прыполе*
*Рабін даспелых аганькі.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

---

**10.** Які назоўнік прапушчаны ў народным выслоўі *старога … на мякіне не правядзеш*?

**А)** салаўя. **Б)** жураўля. **В)** вераб’я. **Г)** бусла. **Д)** дразда.

---

**11.** Выберыце з прапанаваных спалучэнняў словы-пажаданні дабрабыту.

*1) шчаслівa заставацца; 2) будзьце здаровы, як баравікі ў дубровах;*
*3) у гасцях добра, а дома лепш; 4) згубленага не знойдзеш.*

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

---

**12.** Дадзены сказ:

*Браслаўскія азёры называюць блакітнымі кара́лямі Беларусі.*

Колькі слоў у сказе маюць чатыры склады?

**А)** 2. **Б)** 3. **В)** 4. **Г)** 5. **Д)** 6.

---

**13.** Якога слова не хапае ў афарызме?

*Добра ўсё ўмець, ды не ўсё … .*

**А)** памятаць. **Б)** сніць. **В)** расказваць. **Г)** фатаграфаваць. **Д)** рабіць.

---

**14.** Колькі ўсяго слоў, якія маюць два склады, ужыта ў вершаваных радках Е. Лось?

*Радзіма пачынаецца з двароў,*
*Дзе журавель тырчыць, нібыта дрэўка.*
*Радзіма пачынаецца з вятроў,*
*Што паказалі першую запеўку…*

**А)** 0. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

---

**15.** Дадзены сказ:

*Калі трэба было падкаваць каня, выкаваць завесу, ішлі да каваля.*

Колькі назоўнікаў ужыта ў форме вінавальнага склону?

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**16.** Выберыце з прапанаваных назоўнікі I скланення.

*1) лагчына; 2) забава; 3) збожжа; 4) возера.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**17.** Колькі прыслоўяў ужыта ў вершаваных радках А. Ставера?

*Сыплецца мяккі, пушысты сняжок.*
*Белаю коўдрай накрыўся лужок.*
*Лес нерухома стаіць за сялом.*
*Рэчка замоўкла пад тоўстым ільдом.*
*Птушкам знайсці зараз ежу цяжэй.*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**18.** Адпаведнікам рускай назвы кветкі *одуванчик* у беларускай мове з’яўляецца *дзьмухавец*. А як яшчэ называюць гэту кветку ў народзе?

Выберыце патрэбныя варыянты:

*1) жоўтыя цыкор’і; 2) зубнікі; 3) сумніцы.*

**А)** усе варыянты. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**19.** У народзе ёсць прыметы, звязаныя з працай баброў. *Калі восенню бабры валяць дрэвы, рамантуюць запруды, працуюць дружна, то … . Калі паводзяць сябе спакойна – … . Працуюць усю ноч – … .*

Пастаўце на патрэбныя месцы дадзеныя спалучэнні слоў:

*1) чакай добрага надвор’я; 2) будзе дождж; 3) маразы блізкія.*

**А)** 1, 2, 3. **Б)** 2, 1, 3. **В)** 1, 3, 2. **Г)** 2, 3, 1. **Д)** 3, 1, 2.

---

**20.** Выберыце з дадзеных словы, у якіх колькасць літар і гукаў не супадае.

*1) Лагойск; 2) Вілія; 3) Чэрвень; 4) Свіслач.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**21.** Гэты горад такі старажытны, што яго называюць бацькам беларускіх гарадоў. Гэта … .

**А)** Мінск. **Б)** Віцебск. **В)** Полацк. **Г)** Мсціслаў. **Д)** Тураў.

---

**22.** Якое слова памылкова ўжыта ў сказе?

*У дупле жывуць сава, дзяцел, сарока, вавёрка, ліса.*

**А)** сава. **Б)** дзяцел. **В)** сарока. **Г)** вавёрка. **Д)** ліса.